Пра такіх людзей кажуць, што гэты чалавек зрабіў сябе сам. А пачыналася самастойнае жыццё Ларысы Шалятун, як і многіх юнакоў і дзяўчат у далёкія ўжо 50-ыя гады мінулага стагоддзя, на хвалі рамантызму вялікіх будоўляў краіны Саветаў. Скончыўшы ў Паўладары школу, а затым медыцынскае вучылішча, юная медсястра папрасіла накіраванне ў Бранск, дзе на той час пачыналася будаўніцтва гідраэлектрастанцыі. Так з казахстанскіх стэпаў малады спецыяліст-медык трапіла ў Сібір. Працавала педыятрам. Ды, па словах Ларысы Міхайлаўны, дух рамантызму стаў прычынай таго, што яна вырашыла памяняць халат медыка на каску інжынера-будаўніка і паступіла вучыцца ў Іркуцкі інстытут, дзе рыхтавалі спецыялістаў для будаўніцтва аўтазавода "КАМАЗ". У інстытуце пазнаёмілася са сваім будучым мужам, які прыехаў у Сібір "за туманам" з-пад беларускіх Пружанаў, выйшла замуж, нарадзіла дваіх дзяцей. Пасля вучобы па размеркаванню паехала з сям'ёй будаваць "КАМАЗ". І вось там здарылася тое, што цалкам змяніла далейшае жыццё Ларысы Шалятун.

У аўтобус, у якім знаходзілася жанчына, ударыў бензавоз. Пасля аварыі Ларыса Міхайлаўна трапіла ў бальніцу, дзе ў яе пачаліся сур'ёзныя праблемы са здароўем. Дактары ставілі дыягназы глаўкомы, туберкулёзу касцей, злаякаснай пухліны. Лячылася ў розных бальніцах былога Саюза. У тым ліку і на Беларусі ў Пружанскай туберкулёзнай бальніцы, у Бараўлянах пад Мінскам.

Але нідзе лячэнне не пайшло жанчыне на карысць. І пасля 33 месяцаў, праведзеных у бальніцах, дактары параілі Ларысе Міхайлаўне змяніць клімат, фактычна прызнаўшы сваё бяссілле перад хваробай. З Сібіры Ларыса Шалятун пераехала з мужам на сваю радзіму ў Паўладар, дзе на выхаванні ў бабулі, яе маці, знаходзіліся дзеці.

"Тады мне вельмі хацелася жыць, — расказвае Ларыса Міхайлаўна. — Але арганізм настолькі быў атручаны лекамі, што страўнік і печань ужо не выконвалі свае функцыі. І мая маці, шкадуючы мяне і дзяцей, якія маглі застацца сіратамі, параіла паспрабаваць заняцца самалячэннем па метаду Бутэнка. Гэта самачышчэнне арганізма праз аваловоданне спецыяльнай методай дыхання. Я, былы медык, адразу абурылася такой парадзе, не паверыла, што лячэнне такім чынам можа мне дапамагчы. Але выбару не заставалася. І я пачала наведваць заняткі ў групе, дзе спецыяліст вучыла нас самалячэнню па метаду Бутэнка. І першая ўмова — патрэбна было адмовіцца ад усякіх лякарстваў.

Спачатку было вельмі цяжка. Але я вытрымала. А ў хуткім часе адчула, што арганізм мой пачаў ажываць. З'явілася надзея, і за многія гады я першы раз паверыла, што выжыву. І вылечылася. З той пары (вось ужо хутка 15 гадоў) я не ўжыла ніводнай таблеткі, ніякіх лекаў. Потым вучылася, авалодвала іншымі методыкамі нетрадыцыйнай медыцыны. Многа гадоў сама вучу людзей быць здаровымі"...

У Ларысы Шалятун навучаліся самалячэнню па метаду Бутэнка больш за 6 тысяч чалавек па ўсім былым Савецкім Саюзе. У апошнія гады яна ездзіць з лекцыямі і праводзіць заняткі, у асноўным, зімой. А летам рэстаўрыруе з мужам драўляны макет... маскоўскага Крамля. На стварэнне гэтага помніка мастацтва народны ўмелец патраціў больш за 20 гадоў. Ды ў рэчышчы навейшай гісторыі макет стаў непатрэбны Казахстану. І тады Ларыса Шалятун з мужам вывезлі мініКрэмль з Казахстана ў Расію, у надзеі, што знойдуцца людзі, зацікаўленыя ў тым, каб яго адраманставаць. Ды такіх, на жаль, не знайшлося, і ім самім прыйшлося ўзяцца за справу, што вымагае часу, грошай і пэўных здольнасцяў. Але Ларысе Міхайлаўне і гэта справа аказалася па сіле, хоць наперадзе яшчэ многа працы.

У Слонім Ларыса Міхайлаўна трапіла не выпадкова. Тут жывуць яе пляменнікі. Ды і радзіма мужа, Пружаншчына, недалёка. Але галоўнае, гэта незвычайная жанчына паўсюль імкнецца аддаваць свае веды на карысць людзям.

"У сваіх лекцыях, — кажа Ларыса Міхайлаўна, — я імкнуся падштурхнуць чалавека задумацца, хто ён, для чаго жыве на свеце, чаго хоча? І калі з маёй дапамогай чалавек адкажа на гэтыя пытанні, тады ён сам здольны дапамагчы сабе ў жыцці, навучыцца радавацца. І чалавек ад нараджэння, па прыродзе сваёй, валодае здольнасцямі самалячэння. Таму я, у пэўным сэнсе, не лячу людзей, а толькі вучу іх лячыцца. Без лякарстваў.".

Мікола КАНАНОВІЧ



Ларыса Шалятун рэстаўрыруе макет Крамля

"Самае галоўнае, што мы вынеслі ад стасункаў з Вамі — гэта ідэя, думка пра фактычна бязмежныя магчымасці чалавека, як часткі Сусвету...", — напісалі аднойчы ў дзённіку пасля курса заняткаў вучні Ларысы Міхайлаўны Шалятун.
Лячэнне метадам Бутэнка, навучанне самарэгуляцыі арганізма і педагогіцы жыцця прапануе Ларыса Міхайлаўна людзям 15 апошніх гадоў свайго жыцця.

Нявыдуманая гісторыя

Сыноўняя вернасць

Дровы былі сухія, і ў печы адразу ж заклубілася полымя. Іван Іванавіч абставіў агонь гаршкамі, а потым узяў вядро, каб ісці па ваду.

— Ваня, і я ўжо буду ўставаць. Дапамажы мне апрануцца, — пачуўся з-за перагародкі слабы, крыху дрыжачы мацярынскі голас.

Ён дапамог ёй падняцца, апрануцца. Дзевяностадвухгадовая Казіміра Міхайлаўна сама нічога рабіць не можа. Яна не бачыць і амаль не чуе. Але, як і сын, у ложку доўга не залежваецца. Па старой сялянскай звычцы абодва ўстаюць рана. Іван Іванавіч паліць у печы, рыхтуе снеданне, а Казіміра Міхайлаўна сядзіць ля акна. Яна не бачыць, як дрэвы з зямлю пакрыў снег, як скачуць з галінкі на галінку няўрымслівыя снегіры, не чуе, што шумяць за акном старыя ясені. Ужо некалькі гадоў запар яна знаходзіцца ў чорным царстве цемры і пустаты, і толькі ён, яе сын Іван, звязвае старую, нямоглую жанчыну з жыццём.

І маці ўяўляе, як Іван спраўляецца з хатняй гаспадаркай: чысціць бульбу, носіць ваду, рыхтуе корм жывёле. Нялёгка яму, бо ўсё робіць адной рукой. Другую страціў неўзабаве пасля вайны: калі яшчэ быў хлапчуком, нечакана наступіў на міну. Моцна параніўся. І сышло тугой па ім мацярынскае сэрца. Сям'я Жукоўскіх жыла тады на хутары. Набіраліся сілы, раслі дзве дачкі і сын. Ды без дазволу, без папярэджвання прыйшла ў іх дом бяда і пасялілася назаўсёды. Акалечыўся Іван, а неўзабаве памерлі бацька і дарослая дачка. І замест таго, каб песціць ды лашчыць унукаў, Казіміра Міхайлаўна саграваля сваімі слязамі дарагія магілы на вясковых могілках. І яе апорай, падтрымкай у горы стаў Іван. Ён дапамагаў маці ўсім, чым толькі мог. Папраўіўшыся пасля калецтва, адной рукой навучыўся выконваць усякую хатнюю работу, працаваў у калгасе.

Дачка Ніна мела сваю сям'ю і на маці з братам асаблівa не зважала. Яны надта і не крыўдавалі. Мацярынскае сэрца не-не ды і зойдзецца болем, але Іван не даваў доўга тужыць.

— У Ніны сваіх клопатаў шмат, чацвёра дзяцей гадуе, не да нас ёй, — часта казаў сын. — Пражывём, мама. Я цябе ніколі не пакіну, а са мной не прападзеш.

І ў яго спакойных, ласкавых вачах запальваліся гарэзлівыя агеньчыкі.

— Ажаніцца б яму, — не раз думала Казіміра Міхайлаўна. — Ды хто пойдзе за калеку? Праўда, Іван не горшы работнік, чым іншы з дзвюма рукамі, але ж не кожны гэта зразумее...

І вось аднойчы збылося тое, аб чым так марыла маці: Іван прывёў у дом маладую жонку. На першым часе здавалася, што палёгка прыйшла. Маладая гаспадыня ўзялася за работу. Маці радавалася, як завіхаецца нявестка па гаспадарцы, як павесялеў, аж неяк прасвятлеў сын. Ды недаўгавечнай была гэта радасць. Неўзабаве сум агарнуў маладзіцу на хутары. Захацелася ў пасёлак, дзе больш людзей. Ды і даглядаць старэнькую свякроўку, якая пачала траціць зрок і слых, было нялёгка. І нявестка рашылася на разрыў. Не было тут сварак, папрокаў, скаргаў. Разышліся мірна.

— Як жа так, сынок? — у роспачы пытала Казіміра Міхайлаўна. — Не па-людску ж атрымліваецца...

— Маёй віны ў гэтым няма. Сама ведаеш. А ўтрымаць сілай дарослага чалавека нельга. Ды і навошта? Хоча лягчэй пражыць — няхай ідзе. Я пры табе застануся, — сказаў Іван Іванавіч.

Праз некаторы час яны сабралі грошай і купілі хату ў вёсцы Навасёлкі. Казіміра Міхайлаўна, нягледзячы на сваё недамаганне, была невыказна рада пераезду. Цяпер яны жывуць у вёсцы, сярод людзей, цяпер у іх ёсць суседзі. Яны раскажуць пра вясковыя навіны, сагрэюць сэрца добрым словам. А калі трэба — і справай дапамогуць.



Добрыя суседзі — лепш, як радня. Не проста так з'явілася гэта прымаўка. Той, хто ўпершыню вымавіў яе, на сабе адчуў суседскую дабрыню так, як пазналі яе маці і сын Жукоўскія. А ў іх жа таксама ёсць радня. Не за высокімі гарамі і не за сінімі марамі жыве дачка і сястра Ніна, а ўсяго за некалькі кіламетраў. Толькі ніколі не бывае яна ў Навасёлках, як не бываюць тут яе дарослыя дзеці і ўнукі. Дзеля справядлівасці, трэба агаварыцца, што прыязджала неяк адна ўнучка. Але так, нібыта на экскурсію. А вось каб дапамагчы бабулі ці дзядзьку — гэтага няма. Ім іншы раз дапамагаюць чужыя людзі, якія сталі раднёй за родных.

— Я нямала пражыла на свеце, нямала пабачыла, але не перастаю захапляцца гэтым высакародным, працалюбівым чалавекам, — кажа пра Івана Іванавіча суседка, былая настаўніца, Валянціна Сяргееўна Паўлоўская. — Нягледзячы на калецтва, на сталы ўзрост, ён сам мые бялізну, паліць у печы, выконвае розную хатнюю работу. Мы, суседкі, пастаянна напрошваемся ў памочніцы, але ён ветліва адхіляе нашы прапановы, спасылаючыся на тое, што да работы прывычны і яму нецяжка. Уважлівы, добразычлівы чалавек усім нам прыйшоўся па душы. Усяго адзін год жывём у суседстве, а такое ўражанне, нібы ведаем і маці, і сына даўным-даўно.

Часта ад людзей можна пачуць такое разважанне, што, маўляў, дрэнна той маці, у якой няма дачкі. Як ні кажы, а дачка ў цяжкую хвіліну хутчэй прыйдзе на дапамогу, чым сын. Іван Іванавіч усім сваім жыццём, учынкамі абверг гэту думку. Ён паказаў, якім верным і любячым можа быць сыноўняе сэрца, колькі ў ім дабрыні і спагады. І, што самае галоўнае, ён не бачыць у сваіх учынках нічога незвычайнага, лічыць, што так і павінна быць.

Аднойчы знаёмыя прапанавалі Жукоўскаму здаць нямоглую маці ў дом састарэлых. Нічога не сказаў ён тым людзям, толькі ў вачах адбіліся боль і смутак, шкадаванне і разгубленасць, як могуць некаторыя нават гаварыць пра такое.

Больш размову на падобную тэму пры ім не пачыналі.

... Шумяць пад акном ясені. Яны спляліся кронамі і не баяцца ніякіх вятроў. Гэтак і людзі: калі яны дружныя, то ніякай бядзе не зламаць іх, як не зламала яна маці і сына Жукоўскіх.

Кажуць, што дабрыня, як і эгаізм, закладваецца ў характары чалавека прыродай. Калі гэта так, то прырода шчодра абышлася з Іванам Іванавічам Жукоўскім, даўшы самы галоўны, самы бясцэнны дар — вернае і любячае сэрца.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ



Васіль Захарка



Васіль Захарка з жонкаю Пелагіяй, 20-я гады



Першы ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі, май, 1918 год (справа крайні сядзіць Васіль Захарка)



Паштовая марка, прысвечаная Васілю Захарку (Германія, 1949 год)



Магіла Пелагіі і Васіля Захаркаў на Альшанскіх могілках у Празе

НАГОДА

Служыў сваёй БАЦЬКАЎШЧЫНЕ

25 сакавіка беларускі народ адзначыць самае найвялікшае свята – Дзень абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі (Дзень Волі). Менавіта 25 сакавіка 1918 года ў 3-й Устаўной грамаце Рады БНР Беларусь была абвешчана вольнай і незалежнай дзяржавай.
Другім прэзідэнтам Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1928–1943 гадах быў наш зямляк Васіль Захарка. 1 красавіка яму спаўняецца 125 гадоў з дня нараджэння.

Да сённяшніх дзён у вёсцы Дабрасельцы Зэльвенскага раёна пражывае шмат сем'яў з прозвішчам Захарка. Большасць з іх з'яўляюцца далёкімі і блізкімі сваякамі Васіля Іванавіча Захаркі – актыўнага палітычнага дзеяча ў перыяд станаўлення беларускай дзяржаўнасці, прэзідэнта Беларускай Народнай Рэспублікі.

Васіль Захарка нарадзіўся ў 1877 годзе. Маладыя гады былі вельмі цяжкімі. Хлопец рваўся да навукі, а бацькі-сяляне былі бедныя. Калі юнаку споўнілася шаснаццаць гадоў, памерлі яго маці і бацька. Сіротамі засталіся яшчэ два браты і сястра. Летам Васіль даглядаў гаспадарку, а зімою вучыўся.

У 1895 годзе Васіль Захарка здае экзамены на царкоўнапрыходскага настаўніка і атрымлівае працу. Аднак падобныя школы тады плацілі мала настаўнікам, таму праз два гады ён звальняецца і ўладкоўваецца працаваць пісарам.

15 кастрычніка 1898 года Васіля Захарку забіраюць на вайсковую службу. 4 гады ён вучыцца ў ваенна-юнкерскім вучылішчы, пасля звальняецца, як афіцэр запасу.

10 снежня 1904 года, з выбухам японскай вайны, Васіля Захарку зноў забіраюць на вайсковую службу, з якой ён не развітваецца аж да 1917 года.

За час службы наш зямляк набраўся добрага вопыту, хоць і служыў у расійскім войску. У 1906 годзе быў справаводам брыгады, у 1914 годзе – памочнік начальніка аправізацыі арміі паўночна-заходняга фронту, у 1916 годзе – загадчык канцылярыі штаба 10-й арміі, у красавіку 1917 года – намеснік старшыні ваеннага суда штаба 10-й арміі.

2 кастрычніка 1917 года Васіль Захарка вяртаецца ў Менск і прымае актыўны ўдзел у арганізацыі з'езду беларускіх вайскоўцаў заходняга фронту, а 5 лістапада становіцца сакратаром Цэнтральнай Беларускай Вайсковай Рады.

У снежні 1917 года ў Менску адбыўся Першы Ўсебеларускі Кангрэс, дзе наш зямляк быў выбраны сябрам Рады. Калі Кангрэс пачалі разганяць бальшавікі, Васіль Захарка трапляе ў палон.

Уцёкшы з палону, ён пачынае разам са сваім сябрам Кастусём Езавітавым арганізоўваць узброенае паўстанне супраць бальшавікоў. 19 лютага 1917 года Менск быў ачышчаны і Ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі выйшаў з падполля...



Супрацоўнікі Дыпламатычнай Місіі Беларускай Народнай Рэспублікі ў Берліне (трэці справа сядзіць Васіль Захарка), 1919 год

У першым урадзе БНР Васіль Захарка займаў пасаду дзяржаўнага скарбніка, а пасля меў розныя пасады ў міністэрстве. У 1919 годзе прэзідэнтам Рады БНР быў абраны Пётр Крэчэўскі, а яго намеснікам стаў Васіль Захарка.

2 чэрвеня 1920 года, калі бальшавікі выказалі жаданне весці перамовы з урадам БНР, наш зямляк быў назначаны гэтым урадам старшынёй Надзвычайнай Беларускай Дыпламатычнай Місіі. Не дамовіўшыся, аднак, з бальшавікамі, Васіль Захарка вяртаецца з Масквы і вядзе далейшае змаганне за незалежнасць Беларусі.

У сакавіку 1928 года памірае прэзідэнт Рады БНР Пётр Крэчэўскі. Новым прэзідэнтам Рады становіцца наш зямляк Васіль Іванавіч Захарка. Гэта быў нялёгкі час, як для прэзідэнта, так і для Беларусі. Справа ў тым, што ў 1922 годзе, як мы добра ведаем, утварыўся СССР. Таму новаму прэзідэнту са сваёй канцэлярыяй прыйшлося перабрацца на чужыну. Ён пасяліўся ў сціплай хатцы ў ваколіцы Прагі, хоць у гэты час чэхаславацкі ўрад, з прызнаннем СССР, прыпыніў афіцыйныя дыпламатычныя адносіны з БНР.

Але прэзідэнт Васіль Захарка не падаў духам, а таксама не паддаваўся на розныя правакацыі. Ён шмат працаваў, змагаўся за незалежнасць Беларусі, пісаў розныя пратэсты, сустракаўся з прадстаўнікамі еўрапейскіх дзяржаў.

Вось што ўспамінае Ларыса Геніюш пра Васіля Захарку і яго жонку: "Быў ён беларускім эсэрам.У Бога не верыў, але пасля смерці прасіў пахаваць яго па-хрысціянску. Жонка дзядзькі Васіля была родам з маленькага фальварачка Валосава каля сяла Бязводнага, цяпер у Зэльвенскім раёне. Гэта была адукаваная і разумная жанчына. Яна прыязджала да нас, калі ехала да свайго брата і маці. Мы з мужам у 1935 годзе яе фурманкай да іх падвозілі. Пелагія Іванаўна была шчырым і дастойным другам дзядзькі Васіля, а без яе ён пастарэў і асунуўся. Пры мне ён пісаў гісторыю Беларусі. Усё жыццё пра гэта збіраў матэрыялы. Усім нашым ён ахвотна чытаў урыўкі са свае працы, якую не спыняў да смерці...". 6 сакавіка 1943 года Захарка перадаў тэстаментам свае паўнамоцтвы прэзідэнта Рады БНР Мікалаю Абрамчыку, а праз тыдзень яго не стала.

Пахаванне Васіля Іванавіча Захаркі адбылося на Альшанскіх могілках у Празе, якая была акупіравана немцамі. Развітацца з прэзідэнтам Рады Беларускай Народнай Рэспублікі прыехалі дэлегацыі ад розных народаў. Але сказаць развітальнае слова ім гестапа забараніла. Таму атмасфера ў гэты час была надзвычай цяжкая. Яна больш згусцілася, калі пачалі труну апускаць у магілу. У гэты момант Мікола Абрамчык усё ж прыйшоў да магілы і выступіў з невялікай прамовай. За ім сказаў некалькі слоў і прадстаўнік ад украінскай моладзі. А украінскі прафесар Мазепа вымавіў толькі: "Нічога, мы шчэ будэмо маты оказыю промовіты іншым разом".

Больш за ўсіх шкадавала дзядзьку Васіля Ларыса Геніюш. Калі пачалі засыпаць магілу, яна самлела. Спявак Міхась Забэйда-Суміцкі і інжынер Васіль Русак выносілі яе на руках... Смерць прэзідэнта Рады БНР выклікала вялікі рэзананс у Еўропе. Але нямецкая цэнзура не дазваляла друкаваць у газетах артыкулы-некралогі, а таксама кантралявала, каб гэтая сумная вестка не дайшла да Беларусі.

Пахавалі Васіля Іванавіча Захарку побач з яго жонкаю Пелагіяй Іванаўнай Захарка. Магіла, дарэчы, была загадзя закуплена і разлічана на дваіх. Стаяў там і помнік з выявай Пагоні. Пазней на помнік толькі прымацавалі мармуровую шыльдачку з прозвішчам Васіля Захаркі.

Жыццё і дзейнасць чалавека, які шчыра служыў сваёй Бацькаўшчыне, заслугоўвае вялікай манаграфіі. І хочацца верыць, што ў Зэльве ці ў яго роднай вёсцы Дабрасельцы з цягам часу будзе пастаўлены помнік Васілю Захарку. Ён варты гэтага.

Сяргей ЧЫГРЫН

ПОЭЗИЯ

Павел МОДЕСТОВИЧ

Поэма О водке

1.

Водка, водочка родная!
Пьют тебя, не уставая,
Очень вкусно тебя пьют,
В горло льют, и льют, и льют.
Пьют и бабы, и мужчины,
Пьют по делу, без причины.
Пьют запоем и всерьез,
Пьют от счастья и до слез.
Пьют за радость, за удачу,
Пьют за прибыль, недостачу,
Пьют за сына и за дочь,
Пьют и пьют, пока есть мочь.
Пьют и вечером с устатку,
Пьют и горькую, и сладку,
Пьют “Столичную”, родную,
Пьют “Кристалл”, вообще любую.
Пьют по-свински и красиво,
Пьют, ведь водка — аква-диво.
Пьют с соленым огурцом,
Пьют с селедкой и яйцом.
Пьют же часто натощак,
Пьют за тещу, просто так.
Пьют за тех, кого уж нет,
Пьют, чтоб не было у нас бед.
Пьют в кафе, в столовой, в баре,
Пьют толпой, втроем и в паре.
Пьют на службе, на работе,
Пьют и в горе, и в заботе.

2.


Пьют в сортирах, исполкомах,
Пьют и в школах, пьют и дома.
Пьют в садах, лесах и парках,
Пьют в мороз, чтоб было жарко.
Пьют чиновники любые,
Пьют, конечно, “голубые”,
Пьют ее и лесбиянки,
Пьют не просто, ради пьянки ,
Пьют за дружбу, за знакомство,
Пьют за старых, за потомство.
Пьют за доброго коня,
Пьют сваты и пьет родня.
Пьют в больницах, на курортах,
Пьют при болях и абортах.
Пьют сантехники, врачи,
Пьют! Не веришь? Помолчи!
Пьют солдаты, офицеры,
Пьют и пьют ее без меры.
Пьют министры, генералы,
Пьют подолгу, рюмки малы.
Пьют на даче, на природе,
Пьют и в бане, в огороде,
Пьют ее и за углом,
Пьют, когда не близко дом.
Пьют частенько в гараже,
Пьют и девочки уже.
Пьют ее и рыбаки,
Пьют за рыбу и с тоски.

3.

Пьют охотники немного,
Пьют, у них ведь с водкой строго.



Малюнкі Яўгена ІВАНОВА





Пьют водители всегда.
Пьют. ГАИ? Да, иногда!
Пьют студенты, аспиранты,
Пьют доценты, музыканты.
Пьют банкиры, прокуроры,
Пьют и судьи, пьют и воры.
Пьют в налоговой, конечно,
Пьют, работа их не вечна.
Пьют ксендзы и пьют монашки,
Пьют и батюшки из чашки.

Пьют крутые и бичи,
Пьют все, даже стукачи.
Пьют и в офисах, конторах,
Пьют при сделках,
пьют при спорах.
Пьют всегда, пьют каждый день,
Пьют и пьют, кому не лень.
Пьют от страха,
пьют от сердца,
Пьют, ведь пробка —
это дверца,
Пьют, открыв ее разок,
Пьют по кругу, на глазок.
Пьют и сидя, пьют и лежа,
Пьют невесты, все кто как может.
Пьют и ночью, пьют и днем,
Пьют, гори она огнем!
Пьют от скуки, от печали,
Пьют, чтоб жены не молчали.

4.

Пьют в автобусах туристы,
Пьют за сценой и артисты.
Пьют в бытовках,
пьют в Кремле,
Пьют ее на всей Земле.
Пьют, где был СССР,
Пьют чиновники, пьет мэр.
Пьют почти все депутаты,
Пьют, какие там затраты?
Пьют ее и из ведра,
Пьют по суткам, до утра.
Пьют стаканом,
рюмкой, стопкой,
Пьют,
чтоб мягко прошла глоткой.
Пьют почти что семьсот лет.
Пьют, а было столько бед.
Пьют обычно на троих.
Пьют невеста и жених.
Пьют за тех, кто не родился.
Пьют, кто бросил,
кто женился.
Пьют в Музее Русской Водки,
Пьют всегда
не меньше “сотки”.
Пьют французский коньячок,
Пьют, но это пустячок.
Пьют и виски иногда,
Пьют, но это ерунда.
Пьют же водку так давно,
Пьют, не бросят все равно.
Пьют везде, но не в корчме,
Пьют, где льют тебе и мне.

5.

Пьют за все, теряя волю,
Пьют за женщин, за их долю.
Пьют по поводу любому,
Пьют по доброму, по злому.
Пьют и в долг, пьют и в кредит,
Пьют . А печень? Пусть болит !
Пьют до чертиков в глазах,
Пьют, забыв о тормозах.
Пьют и с пивом, и с вином,
Пьют ее и перед сном.
Пьют и летчики в полете,
Пьют, конечно, на турслете.
Пьют всегда на “посошок”,
Пьют, пропив овса мешок.
Пьют, кончая “ запорожной “,
Пьют, ну просто,
сколько можно.
Пьют, не смейся, дорогой,
Пьют, прощаясь, “стременной”.
Пьют, пока все могут пить,
Пьют и пьют, а пить так пить!

Мікола ГРЫШАН

Чаравікі

У Брагінскім раёне, напэўна і сёння, без шнуркоў і без падковак ляжаць чаравікі колішняга першага сакратара ЦК КПБ Слюнькова, якія ён пакінуў для музея падчас наведвання зоны павышанай радыяцыі.

Чаравікі, чаравікі!
Скарб, вядома, невялікі,
Але рэч ёсць, адным словам,
І аўтограф адмысловы.
— Чаго ныеце? Жыць можна! —
Адазваўся чын вяльможны.
Сам падаўся у кабіну,
Нават з ног абутак скінуў,
Бо культурны быў для віду.
А з сабою браць нукліды,
Што прыліпі к чаравікам,
Не рашыўся. Для прыліку
Прыхапіў з сабою ранец,
Дзе паклаў ён свой сняданак.
А людзям сказаў, нарэшце:
— Не бядуйце, рэжце, ешце.
Край вялікі — ўсіх па форме
Не адзенем, не накормім.
Толькі ведайце: мы з вамі...
Верталёт узвыў вінтамі,
На Маскву ўзяў кірунак —
Там яму быў паратунак.



Виктория СЛИВКО

С чистого листа

Страх. Пустота.
Холод. Темнота.
И, кажется, это будет всегда.
Чёрная дыра в душе моей
От того,
что сердце стучит сильней.
Я пытаюсь встать —
сил не нахожу,
Я хочу кричать —
лишь едва шепчу.
Хаос в голове, а в глазах — туман.
В нашем настоящем
кроется обман.
Я хочу узнать,
как найти тот путь,
Тот, который к счастью
сможет нас вернуть.
Коль друг другу
мы будем доверять,
То тогда мы
сможем многое понять.
Главное теперь —
ложь перечеркнуть,
С чистого листа начиная путь.

***

Кто сказал, что любви не бывает?
Ведь она, словно ангел с небес,
Нашу личность собой озаряет
И, как будто, не знает завес.
Но преграды бывают не редко,
Если кто-то не может понять,
Что, быть может,
не часто, но метко
Он способен в любовь попадать.
Перед тем,
как попасть, он стреляет
И порой, не снимая оков,
Стрелою своей убивает
То живое, чьё имя — любовь.
С каждым часом она угасает
И потом не вернётся уж вновь.
Но когда же
убийство свершилось,
Ты виновных тогда не ищи,
Так как умерло то, что родилось;
Можешь сердцу сказать:
трепещи!
Если вдруг зародится иное,
Но кристальное чувство любви,
Ты уж вспомни убийство былое,
От ошибок себя огради.

ПРОЗА

Судьба

Он всегда знал, что своей смертью не умрёт. Ещё в детстве ему предсказали, что он утонет.

А тонуть уж очень не хотелось, и в целях безопасности он уехал в пустыню. Сначала всё было хорошо. Никакой воды. Вернее, вода только в кувшинах и чашках... тёплая и гнилая, да и то не всегда.

Цивилизации никакой, сплошная антисанитария, местные жители просто безмозглые тушканчики, везде раскалённый жёлтый песок и жара, жара, всегда жара...

Долгие годы он провёл в пустыне. Но всё-таки ему не удалось обмануть судьбу. Кто же знал, что можно утонуть, захлебнувшись злобой.



Могила



Они отодвинули камни, взяли лопаты и стали копать. На глубине шести футов оказалась металлическая дверь. Наконец-то!

Значит, он не ошибся. На двери печать жрецов — шакал над девятью связанными пленниками. Их ждут несметные сокровища. Оба его спутника заволновались. Грязные арабы, грабители могил, они прирежут и родную мать — было бы уплачено. Дверь заскрипела и открылась. Лорд Эдвин первым шагнул в темноту.

Грабители с факелами бросились за ним. Сокровища были здесь. Очнувшись от многовекового могильного сна, они мигали заспанными глазами и бросали по сторонам испуганный свет. А грязные воровские руки, не давая им опомниться, хватали и совали их в пыльные вонючие мешки. Лорд Эдвин достал револьвер.

В могильной пустоте прогремели два выстрела. Он посмотрел на мумию и подумал: "Старый труп лучше новых двух".

Пёс

За окнами бушевала гроза, но Сан Саныч спокойно спал в своём уютном дачном домике.

В полночь под окном призывно залаяла собака. Сан Саныч вздрогнул и проснулся. "Да чтоб тебя", — заворчал он и повернулся на другой бок. Но собака не унималась, и сон совсем пропал.

"Ни днём, ни ночью покоя нет", — застонал Сан Саныч, нащупывая рукой пачку папирос, а ногами тапочки. Он набросил куртку и вышел на крыльцо.

Дождь лил как из ведра, но пёс, большой рыжий сеттер с белым пятном на груди, не уходил. "Жрать небось хочешь? — попыхивая папироской, сочувственно спросил Сан Саныч. — Иди сюда, под навес-то."

Но сеттер не пошёл, а, напротив, слабо повизгивая, стал медленно удаляться. Странно. В поведении собаки было что-то необычное. Сан Саныч поднял капюшон и пошёл за псом.

Не успел он дойти до калитки, как сверкнувшая молния ударила в дом. Там, где находилась кровать, мгновенно вспыхнул огонь.

Сан Саныч бросился спасать машину, но вспомнил о собаке. Он несколько раз свистнул и огляделся... Рыжий сеттер исчез.


Позже, когда погорелец рассказал о случившемся соседу, тот заволновался:

— По описанию пёс очень похож на моего Джека.

— Где же он? — обрадовался Сан Саныч. — Я у него в долгу.


— Джек умер два месяца назад, — еле слышно прошептал сосед.


Игорь ПРОКОФЬЕВ



Газета Слонімская
21 — 27 сакавіка 2002г. №12 (250)

ГАНДБОЛ


Атакуют слонимчане


Установка на игру тренера Владимира Рысика

НАДО БЫЛО ПРОЯВИТЬ ХАРАКТЕР

Очередные игры первенства Гродненской области по гандболу слонимские юноши и девушки проводили дома. На прошлой неделе они принимали соперников из Щучина.

Все четыре игры отличались упорством и хорошим настроем на борьбу. К сожалению, не все получилось в этом раунде соревнований у слонимских спортсменов. Младшие мальчики (1989 г. р.) уступили в своем матче со счетом 15:20, а старшие свели свою встречу с соперниками вничью 19:19.

Несколько лучше выглядели на площадке девочки. Младшие, проигрывая еще за 5 минут до конца игры три мяча, сумели отыграться и закончили матч с ничейным результатом 8:8. Старшие девушки были вообще на голову выше щучинских гандболисток. Итоговый счет этой игры говорит сам за себя – 23:14.

Тренеры слонимских юношей и девушек Ирина Оржинская и Владимир Рысик по результатам прошедших игр отметили грамотную и полезную игру Татьяны Грек (СШ №5), Татьяны Санюк (СШ №3), Антона Чуба (СШ №9), Андрея Кислого (СШ №5), Юлии Мещишиной и Кати Фибик (обе – ПТУ-129).

Следующие матчи гандболисты слонимской ДЮСШ №1 проведут 14 апреля на выезде в Зельве.

Валерий КОВАЛЕНКО

ЛЫЖЫ

ЧАТЫРЫ МЕДАЛІ АЛІМПІЯДЫ

Менавіта столькі ўзнагарод прывезлі ў Слонім тры нашыя землякі з Алімпіяды палякаў свету, што праходзіла ў польскім горадзе Шчырк.

Спаборніцтвы гэтыя праводзіліся паміж ветэранаў, і свае каманды на гульні выставілі 22 краіны. У складзе зборнай Беларусі ўдзел у Алімпіядзе прынялі і тры слонімцы: Пётр Грэцкі, Сяргей Валчуновіч і Сяргей Мацкевіч. Усе яны працуюць на кардонна-папяровым заводзе, але са спортам развітвацца не збіраюцца. З Польшчы слонімцы прывезлі чатыры медалі лыжных гонак Алімпіяды.

Срэбра на дыстанцыі 5 км і бронзу на дзесяцікіламетроўцы заваяваў Пётр Грэцкі ва ўзроставай групе 50-60 гадоў. Яшчэ два медалі – і абодва бронзавыя – на аднолькавай дыстанцыі 10 км, але ў розных узростах выйгралі Сяргей Валчуновіч (35-40 год) і Сяргей Мацкевіч (30-34 гады).

Таксама выдатна выступіла і беларуская зборная, якая заняла агульнае трэцяе каманднае месца ў неафіцыйным заліку Алімпіяды.

Валерый КАВАЛЕНКА

МИНИ-ФУТБОЛ

41 ГОЛ В ЧЕТЫРЕХ МАТЧАХ

В прошедшие выходные две слонимские мини-футбольные команды с мальчишками 1988 и 1989 годов рождения выезжали на спарринговые матчи в Гродно.

Каждая команда провела по две игры. Футболисты 1988 г. р. два раза обыграли гродненский "Прамень" со счетом 25:4 и 9:4. А игроки команды 1989 г. р. взяли достаточно убедительный реванш за поражение в январе над сверстниками из команды "Университет" (Гродно): 5:2 и 2:1.

Таким образом, общий счет четырех матчей слонимчан с гродненскими командами – 41:11 в пользу воспитанников тренера Руслана Корнева.

Валерий КОВАЛЕНКО

ШАШКІ

ПАСПЯХОВЫ ДЭБЮТ

На працягу дзесяці дзён у Віцебску праходзілі гульні чэмпіянату Беларусі па шашках сярод жанчын у вышэйшай лізе.

Упершыню ў гісторыі слонімскіх шашак удзел у такім прадстаўнічым турніры прыняла адзінаццацікласніца СШ №10 Ганна Барысік. Яна з'яўляецца кандыдатам у майстры спорту і выступіла для дэбютанткі даволі ўдала.

Пятае месца чэмпіянату дазволіла Ганне захаваць месца ў вышэйшай лізе і на будучы год.

Яўген ІВАНОЎ

ВЫЗНАЧЫЛІСЯ ФІНАЛІСТЫ

У слонімскім шахматна-шашачным клубе скончыліся гульні абласных занальных спаборніцтваў у праграме клуба "Цудашашкі".

Атрымаўшы буйныя перамогі над сваімі сапернікамі, з вялікім адрывам на першае месца выйшлі шашысты горада Слоніма. У складзе каманды-пераможцы гулялі Юрый Курцэвіч і Максім Кандзіранда з СШ №8, Андрэй Мацявін (СШ №9), Кацярына Амагамедава (СШ №10). Даволі ўпэўнена згуляла і каманда Слонімскага раёна, у складзе якой былі вучні Рахавіцкай СШ Андрэй Зенаў, Юрый Журовіч, Дзмітрый Шаўцоў і Аксана Арцёменка.

Менавіта гэтыя дзве каманды і заваявалі пуцёўкі ў фінал спаборніцтваў, гульні якога адбудуцца ў Гродне ў сярэдзіне красавіка. А на трэцім месцы і па-за фіналам засталіся шашысты Зэльвенскага раёна.

Яўген ІВАНОЎ

ФУТБОЛ

"КАМУНАЛЬНІК" ВЫХОДЗІЦЬ НА ПОЛЕ

У мінулую суботу слонімскі футбольны клуб "Камунальнік" правёў першую спарынгавую гульню з камандай "Баранавічы" на полі ў Альбярціне і выйграў.


Перад трэніроўкай можна крыху і расслабіцца. Гульні ж будуць патрабаваць поўнай самааддачы

Чатыры безадказныя галы ў вароты гасцей правялі Мікалай Астапчык, Дзмітрый Аначэнка, Павел Яўсеенка і Максім Горбач. Але ж вынік не заўсёды гаворыць аб якасці гульні, бо нашыя сапернікі выглядалі слаба.

Тым не менш, па словах галоўнага трэнера слонімцаў Барыса Лазарчыка, футбалістам "Камунальніка" удалося выканаць асноўныя трэнерскія ўстаноўкі. Нядрэнна атрымліваліся флангавыя праходы, пасля аднаго з якіх быў забіты гол. У матчы слонімцы спрабавалі эфектыўна рэалізоўваць напрацаваныя на трэніроўках стандартныя становішчы і іх выкананне, тактычныя задумкі трэнера, адшліфоўвалі сыгранасць і ўзаемаразуменне футбалістаў на полі. Як адзначыў Барыс Лазарчык, не ўсё яшчэ атрымліваецца, як таго хацелася б, але ў хлопцаў ёсць жаданне змагацца, выкрышталізоўваюцца пакрыху агульнакамандныя дзеянні.

Наступны спарынг трэнерскі штаб "Камунальніка" плануе правесці ў Слоніме ў чацвер, 21 сакавіка, зноў-такі з камандай "Баранавічы".

Валерый КАВАЛЕНКА

ФУТБОЛ

НОВЫЙ ТУРНИР СБОРНЫХ

В мае 2002 года в России пройдет турнир под названием "Кубок LG Electronics".

Участие в нем примут сборные России, Украины, Югославии и Беларуси. Призовой фонд соревнований установлен в размере 150 тысяч долларов.

17 мая состоятся первые, полуфинальные, игры: Украина – Югославия и Россия – Беларусь. Финал и матч за третье место пройдут 19 мая. Все игры пройдут на стадионе "Локомотив" в Черкизове.

Победитель турнира будет награжден Кубком компании "LG Electronics".

Валерий КОВАЛЕНКО

ФУТБОЛ

СОВЕТ ФК "КОММУНАЛЬНИК"

В понедельник состоялось совещание Совета ФК "Коммунальник". Решались организационные вопросы деятельности клуба на предстоящий год.

Произошли и некоторые изменения в составе Совета клуба. Президентом клуба избран председатель Слонимского райисполкома Мечислав Костюк, вице-президентом – Роман Мамедов (ООО "Телкон"), генеральным менеджером – Геннадий Бабошкин (ООО "Телкон").

Ответственным секретарем стал Игорь Царук, заведующий отделом по физической культуре, спорту и туризму Слонимского исполкома. Избраны еще пять членов Совета клуба. Это Сергей Рагозик (Слонимский Совет депутатов), Василий Шкодов (ОАО "Слонимский водоканал"), Юрий Бессонов (управление магистральных газопроводов), Ярослав Халецкий (Слонимский РОВД) и Олег Бердула (ОАО "Слонимский мясокомбинат"). Еще два члена Совета клуба с совещательным правом голоса – директор ФК "Коммунальник" Михаил Гончар и главный тренер команды Борис Лазарчик.


Старший тренер команды – Валентин Городников, тренер – Александр Гусар. Остаются вакантными еще две должности – врача и администратора "Коммунальника".

Валерий КОВАЛЕНКО

КОНКУРС • КОНКУРС • КОНКУРС • КОНКУРС • КОНКУРС • КОНКУРС

ШАХМАТЫ

Задание №2




Белыя: Кр g3, В f4, С e7, К b4, К g5, пп. c6, f2, g4.
Чорныя: Кр e5, С в2, С d7, К c5, п. c4.

Белыя пачынаюць і даюць мат у два хады.

ШАШКІ

Заданне №2



Белыя: a5, c1, d2, e5, f4, g3, g5 (7).
Чорныя: b6, b8, c7, e3, g7, h6, h8 (7).

Белыя пачынаюць і выйграюць.

Адказы дасылайце на адрас "ГС" з паметкамі "шахматы" і "шашкі" суадносна, на працягу двух тыдняў са дня апублікавання.

КОНКУРС • КОНКУРС • КОНКУРС • КОНКУРС • КОНКУРС • КОНКУРС

ТУРНИР ПО МИНИ-ФУТБОЛУ


С **25 по 26 марта 2002 года** в городском спорткомплексе г. Слонима будут проводиться соревнования по мини-футболу.

Участие в турнире могут принять все желающие в возрасте 1988 г. р. и младше (кроме учащихся ДЮСШ). Заявки на участие команд (состав – 7 человек) подавать в судейскую коллегию в день открытия турнира по адресу: ул. Пушкина, 57. **ОТКРЫТИЕ:** 25 марта в 9 часов утра.

ПРОГНОЗ ПОГОДЫ

Информация предоставлена сайтом www.meteo.by

на 20 - 27 марта



Дата	20		21	
Время суток	ночь	день	ночь	день
Температура, С	5	7	3	4
Скорость ветра, m/sec	4	3	4	4
Дата	22		23	
Время суток	ночь	день	ночь	день
Температура, С	-1	5	-1	5
Скорость ветра, m/sec	1	0	3	5
Дата	24		25	
Время суток	ночь	день	ночь	день
Температура, С	4	5	1	4
Скорость ветра, m/sec	4	4	2	1
Дата	26		27	
Время суток	ночь	день	ночь	день
Температура, С	0	6	0	6
Скорость ветра, m/sec	0	1	0	2

ГОРОСКОП НА НЕДЕЛЮ

от www.ignio.com



ОВЕН

Неделя может оказаться неоднозначной, усыпанной подводными камнями, и Вам придется стать талантливым стратегом, чтобы все прояснить и расставить по своим местам. Не обязательно все проблемы решать самостоятельно, в некоторых ситуациях помощь или совет друзей помогут Вам избежать перегрузок и переутомления. Среда может стать одним из самых удачных дней недели, постарайтесь максимально использовать этот благоприятный момент, поделитесь своими идеями с начальством, и оно Вас поддержит. В пятницу будьте осторожнее, общаясь с коллегами по работе, следите за своей речью. Пока Ваш имидж работает на Вас, направьте энергию в сферу личных отношений.



ТЕЛЕЦ

Наступило время ненавязчиво заявить о себе и напомнить о своих идеях. В понедельник и вторник желательно ничего кардинального не предпринимать, а вот, начиная со среды, используя свои разнообразные способности, Вы можете достигнуть хороших результатов. В четверг, вероятно, появится важное дело, требующее от Вас терпения, внимания и предвидения даже мелочей. Соединив свои желания и возможности, запланировав свои действия, Вы обретете новые финансовые возможности. В пятницу будьте осторожны, Вас может подвести доверчивость.



БЛИЗНЕЦЫ

Завершите накопившиеся дела в понедельник и вторник, и у Вас появится возможность проявить себя творчески. От того, насколько Вы проявите свое трудолюбие, будет зависеть Ваше благосостояние. Не отмахивайтесь от интересных мыслей и оригинальных идей, которые посетят Вас. Даже появится возможность начать реализовывать некоторые из них. Начиная со среды, благоприятно подписывать договора и официальные бумаги. Если возникнут какие-то волнующие Вас неясности, постарайтесь их дипломатично прояснить. В понедельник вероятны перегрузки на работе.




РАК

В понедельник удачно сложатся дела, связанные с оформлением документов. Вам необходимо подумать о повышении своего профессионального уровня, в среду вероятна ситуация, которая позволит решить этот вопрос без больших усилий с Вашей стороны. Пятница - довольно удачное время для начала новых действий, откажитесь от некоторых старых стереотипов и взглядов, которые мешают Вам продвигаться вперед. В четверг соберитесь, найдите в себе силы и завершите тяжелую работу. Справившись с накопившимися домашними делами, Вы почувствуете радость от завершенности.



ЛЕВ

Вам потребуется выдержка и четкость в делах. Необходимо реализовать хотя бы часть намеченных планов. Понедельник благоприятен для начала новых дел. В четверг желательно меньше контактировать с людьми. Пятница благоприятна для начала чего-то нового. На этой неделе Вы сможете между делом для себя решить вопрос, где именно и чему именно Вам необходимо учиться. Друзьям может понадобиться Ваша помощь. В выходные постарайтесь не перегружать себя домашними хлопотами.



ДЕВА

На работе Вас может закружить вихрь неотложных дел. В понедельник и пятницу будут удачными поездки и командировки. Важные встречи во вторник и серьезные переговоры могут принести ожидаемые результаты. Существует хорошая возможность наладить отношения с партнерами по работе, а также использовать своевременно предложенную Вам помощь. Необходимо следить за своей речью, чтобы не оказаться в щекотливом положении. У Вас будет возможность проявить свои деловые качества и способности. Если это возможно, часть работы возьмите на дом, спокойная, уютная обстановка позволит легко справиться со всеми делами. В субботу возможны непредвиденные расходы на детей.

ВЕСЫ

В начале недели подведите итог Вашей деятельности и постарайтесь устранить недочеты и промахи. Неделя располагает к налаживанию и обновлению партнерских отношений, также способствует расширению важных связей и контактов. Мысль обучиться чему-нибудь новому весьма здрава и своевременна. Побольше уверенности в себе. В среду, используя свое обаяние и дипломатические способности, Вы можете достичь своей цели и привлечь к делам окружающих.

СКОРПИОН

Начало недели может быть весьма напряженным, поэтому запаситесь терпением и не предпринимайте никаких решительных шагов. Среда - благоприятное время для решения личных и служебных дел. Велик шанс найти средства для реализации своих идей. Вы будете ощущать поддержку окружающих в своих начинаниях. Вероятны позитивные перемены на работе. Четверг, благоприятен для поездок и путешествий. Постарайтесь быть интересными и обаятельными собеседниками.

СТРЕЛЕЦ

Постарайтесь умерить свои запросы и амбиции и прислушайтесь к мудрым советам окружающих. Вы сумеете преодолеть трудности и добиться прекрасных результатов только в том случае, если не станете требовать от жизни все и сразу - терпение Вам очень пригодится. Желательно продумать главные задачи и цели на текущий момент и ближайшее будущее. Ситуация, сложившаяся в начале недели, может испытывать Ваше трудолюбие и трудоспособность. Четверг полон обольщений и разочарований, однако если Вы выдержите это испытание, то надолго обеспечите себя средствами.



КОЗЕРОГ

В первой половине недели будьте осторожны в действиях и выражении своего отношения к чему-либо. В понедельник вероятны конфликтные ситуации. Прислушайтесь к голосу интуиции, и Вы окажетесь в нужное время в нужном месте. Постарайтесь повременить с дальними поездками до воскресенья, так как они не оправдают Ваших ожиданий. На этой неделе возможна весомая прибыль от совместного бизнеса с энергичными партнерами. Однако от рискованных проектов с примесью авантюризма лучше отказаться. Посвятите больше времени дому.

ВОДОЛЕЙ

Вам необходимо сосредоточиться и планомерно реализовать хотя бы часть своих идей, причем в первую половину недели. Во вторник смело опирайтесь на помощь друзей, а в среду Вам придется отстаивать свои идеи. Проявите терпение и выдержку, и Вы многого достигнете. Ваша настроенность на общение позволит возобновить утраченные связи, обрести новые знакомства, узнать много интересного и полезного для Вас. В четверг оригинальный подход к делу может способствовать Вашей удаче на работе. Выходные лучше провести дома.

РЫБЫ

Наступает время подведения итогов и переоценки ценностей. Поверьте в свои силы, сейчас наступает благоприятный момент для реализации Ваших замыслов. Сомнения, которые Вы ощущаете, могут тяготить Вас, но Вы со всем справитесь и почувствуете желанное облегчение. Зависимость от начальства будет смущать Вас, но ее компенсируют денежные поступления. В четверг можете рассчитывать на помощь друзей. Пятница благоприятна для плодотворного дружеского общения.

Что было бы, будь мужчины на самом деле абсолютными хозяевами жизни?

☺ Восьмое марта перенесли бы на двадцать девятое февраля. Раз в четыре года это еще можно вынести.

☺ Галстук можно было бы не завязывать. А ширинку не застегивать.

☺ Всех женщин звали бы одинаково — для простоты в общении.

☺ У всех женщин была бы аллергия на золото, драгоценные камни и меха животных.

☺ Кошек разрешено было бы держать только в двух местах: в холодильниках китайских ресторанов и в тирах — в качестве мишеней.

☺ Каждый телефонный аппарат был бы снабжен устройством, прерывающим связь через тридцать секунд разговора.

☺ Салфетки так и остались бы не изобретенными. Галоши тоже.

☺ За проезд в левом ряду со скоростью шестьдесят километров в час расстреливали бы на месте.

☺ Чтобы расстегнуть застежку бюстгальтера, достаточно было бы легко на нее дунуть.

☺ Выдав дочь замуж, мать автоматически забывала бы о ее существовании. Таким образом, проблема тещ была бы решена окончательно.

☺ В начале передачи новостей дикторы рассказывали бы все свежие матерные анекдоты.


☺ Были бы изобретены носки, которые всегда существовали бы только попарно. Оставленные тобой в разных местах, они энергично подползали бы друг к другу.

☺ В каждом баре стояли бы раскладушки для тех, кто не собирается сегодня отсюда уходить.

☺ Мусорные пакеты покидали бы дом самостоятельно. Достаточно было бы хорошенько поддать им ногой.

☺ Никто не относился бы ни к чему слишком серьезно.

Венгерское вычёркивание от Дмитрия Трофимовича



Б	У	Д	А	Н	Г	А	Р	И	Т	О	Р	Т	Н	О
Е	Т	О	Ф	Д	А	Т	О	Р	Ж	О	А	С	Г	В
Р	Б	Р	Е	О	Р	М	Б	А	Р	Т	Е	С	И	А
Р	Ч	Е	Б	П	Н	И	Я	З	Е	Д	Л	Ь	Ь	Т
О	О	Л	А	Л	О	Ь	Л	А	Ц	Р	О	Н	Т	Ю
М	В	Е	Л	А	Т	Т	С	И	А	К	К	О	К	Р
А	С	К	Ь	Н	К	С	А	Р	И	С	О	К	Н	Н
Н	М	Е	З	А	О	Т	С	С	П	И	Д	О	Ю	А
С	А	Н	О	М	Л	Ф	О	Д	А	В	Т	Н	С	Н
М	А	Ц	К	Ц	И	О	Р	Т	Л	Р	И	О	О	Р
О	Р	А	Р	А	Ч	Н	Т	Ш	О	И	Ж	Р	П	У
Л	И	Г	А	Г	У	Н	А	О	К	Д	Я	П	О	Р
А	Н	И	И	Р	М	С	А	К	С	А	Л	Ф	Н	И
Н	У	С	Н	И	А	А	Л	А	У	Л	О	У	М	Я
А	Г	И	А	Ф	Р	О	К	Я	Р	Ь	Г	К	А	И
Н	А	Ж	Д	А	К	М	И	К	С	Е	Р	О	Р	Г

В буквенном хаосе спрятаны слова, приведённые ниже, которые необходимо найти и вычеркнуть. Слова читаются по вертикали, горизонтали, слева направо, справа налево, могут ломаться, изгибаться, но не по диагонали.

Бутерброд, базальт, нюанс, донор, аккорд, бальзам, ангар, романс, иврит, человек, рупор, ноктюрн, оргия, ассигновать, пони, отель, рок, чума, гриф, сари, тори, армия, си, феод, смена, торт, сорт, окраина, маца, ярус, столица, нуга, оригинал, жрец, камуфляж, шоколад, список, фонтан, наждак, планктон, миксер, идальго, салака.



Малюе Сяргей АЛІЗАРЧЫК

ОТВЕТЫ НА кроссворд (№249)

По горизонтали
7. Батальон. 8.Лонжерон. 10. Пушка. 11. Лафет. 12. Кожедуб. 15. Секира. 18. Чапаев. 19. Конев. 20. Сапа. 21. Танк. 23. Мосин. 25. Фрегат. 26. Кортик. 31. Новиков. 33. Ангар. 34. Дозор. 35. Глиссада. 36. Легионер.

По вертикали
1. Камуфлет. 2. Шашка. 3. Шомпол. 4. Корпус. 5. Редан. 6. Ловердек. 9. Шлем. 13. Триплан. 14. Макаров. 16. Погон. 17. Девиз. 22. Шрапнель. 24. Пистолет. 27. Рокада. 28. Мина. 29. Гонвед. 30. Шасси. 32. Порох.

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947
ад 24.03.1997г.

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Віктар ВАЛАДАШЧУК

ЗАСНАВАЛЬНІК
Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі:
231800, г.Слонім,
вул. Камсамольская, 8.
Тэлефоны:
рэдакцыі 2-14-39
..........(017)210-81-80
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.
Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.
Рэдакцыя таксама не адказвае за змест рэкламы.

Падпісана да друку
19 сакавіка 2002г.
Час падпісання 7:00.
Надрукавана
ў Гродзенскім абласным унітарным прадпрыемстве "Слонімская друкарня", г.Слонім, вул. Хлюпіна, 16.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

E-MAIL: gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by Аб'ём — чатыры друкаваныя аркушы

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)

ЗАКАЗ № 873

